## Выхаваўчая гадзіна з цыклу «Вянок жаночых лёсаў»

**Падрыхтавала Новік В.І., настаўніца гісторыі**

**Мэта мерапрыемства:** выхаванне ў вучняў пачуцця гонару за сваё гістарычнае мінулае, павагі да жанчыны-маці, жанчыны-гістарычнага дзеяча; развіццё творчых здольнасцей вучняў.

Гучыць мелодыя "Ave Maria". Выходзяць дзве вядучыя.

*1 вядучая.* У гісторыі кожнага народа мноства вялікіх імёнаў. І сярод іх шмат жаночых. Менавіта з Жанчыны і пачынаецца гісторыя нацыі. Яе імя, жыццё, справы ахутаны легендамі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, а сама яна ўшаноўваецца як вялікая Маці.

*2 вядучая.* Сярод жанчын, чые цудоўныя вобразы і вялікія справы дайшлі з глыбіні вякоў да нашых дзён, ганаровае месца займаюць абаронца Айчыны, княгіня-амазонка Анастасія Слуцкая (Алелькавіч), праваслаўная святая Соф'я Радзівіл, першая беларуская жанчына драматург Францішка Уршуля Радзівіл, падарожніца і каралеўскі лекар Саламея Пільштынава, беларуская Жанна д'Арк Эмілія Плятэр, першая жанчына геолаг Ганна Місуна і мноства іншых.

*1 вядучая.* Сёння мы раскажам аб лёсе слаўнай дачкі Беларусі, якая з'яўляецца пуцяводнай зоркай для нас - Ефрасінні Полацкай.

**Гісторыя першая** "Заступніца зямлі беларускай".

*Інсцэніроўка.* За сталом з кнігамі сядзіць прыгожая юная дзяўчына і разважае ўслых.

— Што будзе, калі надумае бацька аддаць мяне замуж? Калі здарыцца так, смутку на гэтым свеце нельга будзе пазбегнуць! Што ж паспелі зрабіць нашыя роды, якія былі да нас. Жаніліся і выходзілі замуж, княжылі, але не вечна жылі; жыццё іх праплыло, і загінула слава іхняя, быццам прах, горай за павуцінне. Затое жанчыны, што жылі раней і, узяўшы моц мужчынскую, целы свае аддалі на пакуты і паклалі галовы пад меч за веру Хрыстову, а іншыя хоць і не схілілі шыі свае пад жалеза, але мячом духоўным адсеклі плоцкія асалоды, — тых памятаюць на зямлі.

У святліцу зайшоў бацька Прадславы, князь Святаслаў.

- Нявеста ты ўжо ў нас, князёўна.

–Гадамі – нявеста, — адказала Прадслава.

— Ці, можа, князі табе не па сэрцы?

– Не, бацька, па сэрцы.

— Можа, непрыгожыя?

– Прыгожыя, але неразумныя.

– А калі і гожыя, і разумныя? — пытаўся князь.

— Дык душою слабыя.

— Забудзеш пра гэта сярод забаў і весялосці...

— Ведаю з кніг, што пасля забаў будзе... Першая забава — срэбралюбства. Чым болей багацця, тым сквапнейшае і падлейшае робіцца любое стварэнне. Ад другой забавы абвісае цела, крывяцца косці, хвароба ў нутро запаўзае. Гэтая забава завецца дагаджэнне чэраву. Ад трэцяе забавы траціць чалавек свій розум. Гэтая забава — распуста.

Князь глядзеў на дачку ўражана.

— Хіба ж няма ўцехі ў тым, каб княжычаў нарадзіць?

— Нараджаюцца княжычы, і ўсобіцы крывавыя між імі нараджаюцца — сказала дзяўчына.

— Што табе да мужчынскіх усобіц? Жыві за князем сваім, дзяцей гадуй.

— На меч упадзе мой князь, а дзяцей браты заб'юць.

—Дзе ж знойдзеш долю сваю, калі не за мужам?

— Ува мне доля мая.

— Як жа адна, без абароны мужавай жыць думаеш?

— Як трава без абароны расце...

— У каго ж розуму вучыцца будзеш, як не ў мужа?

— У кніг, што мудрасць сабралі, як пчолы мёд.

— Дзе ж сям’я твая будзе?

— Увесь свет — сям’я мая...

— Але ж мінулася табе ўжо 12 гадоў — трэба збірацца замуж. Ды і сваты зачасцілі.

*Вядучыя расказваюць пра далейшы лёс Ефрасінні.*

Але князёўна дабілася свайго і пад імем Ефрасінні патаемна ад бацькоў прыняла пострыг. Ефрасіння перапісвала кнігі. Грошы, атрыманыя ад продажу гэтых кніг, яна раздавала бедным. Людзі, беручы грошы, цалавалі рукі добрай дзяўчынкі-манахіні, бласлаўлялі яе. Ефрасіння Полацкая заснавала ў вёсцы Сяльцо жаночы манастыр, затым мужчынскі. Тут былі адкрыты майстэрні па перапісванні кніг — скрыпторыі. Каб аздобіць полацкія храмы абразамі, Ефрасіння стварыла таксама іканапісную майстэрню. Адкрыты былі школы для полацкіх дзяцей. Гэта па яе жаданні і за яе грошы ювелір Лазар Богша стварыў шэдэўр — крыж Ефрасінні, які яна затым падарыла манастыру і які з’яўляецца святыняй беларускай зямлі.

Памочніцамі і апораю вялікай манахіні былі яе сёстры: родная Гардзіслава (у манастве Еўдакія) і стрыечная Звеніслава (у манастве Еўпраксія). Еўдакія пазней стала ігуменняй і працягвала асветніцкую дзейнасць сваёй старэйшай сястры. А Еўпраксія здзейсніла разам з Ефрасінняй апошняе падарожжа-паломніцтва ў Ерусалім, дзе і пахавала сястру. Некаторыя вучоныя лічаць, што менавіта яна была аўтарам “Жыція Ефрасінні Полацкай”. А гэта значыць, што Еўпраксія з’яўляецца першай беларускай пісьменніцай.

Хрысціянская царква кананізавала Ефрасінню. Так і смерцю сваёй княжна Ефрасіння-Прадслава Полацкая заклікала людзей да адзінства, сяброўства, братняй любові. З тых далёкіх дзён і да нашага часу святая Ефрасіння — галоўная нябесная заступніца Белай Русі, першая ў пантэоне нашых святых.

**_Верш “Еўфрасіння Полацкая”_**

***Рэфлексія “Рамонак”.*** Сэнс жыцця Еўфрасінні Полацкай *(у цэнтры).*

*Пялёсткі рамонка:*

1) служыць Богу і Радзіме;
2) асветніцтва;
3) вучыць хрысціянскай мудрасці;
4) вучыць культурнай працы;
5) аб’ядноўваць людзей хрысціянскай этыкай;
6) рабіць дабро;
7) дапамагаць людзям.

*Вядучая.* Ёсць людскія лёсы, што прамільгнуць на жыццёвым небасхіле вокамгненна і знікнуць назаўсёды. А ёсць імёны, што гараць стагоддзі яснай зоркай у свеце жыцця, прымушаюць углядацца ў высокую далячынь. Хай жа для вас, мае шаноўныя сябры, гарыць зорка Еўфрасінні Полацкай. Хай яе справы асвятляюць і ваш жыццёвы шлях.